Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Скажыце, доктар...

ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНАЯ ГІПЕРТАНІЯ?

Мы прызвычаіліся лічыць, што гіпертанія — праблема людзей пажылога ўзросту. Але гэта не так: хвароба імкліва маладзее. Мы мала рухаемся, ужываем тлустую ежу, наша жыццё напоўнена стрэсамі і хваляваннямі. Пабочны эфект сучаснага ладу жыцця — праблемы з сэрцам і сасудамі. Яны проста не спраўляюцца з тым грузам, які мы штодзень на іх ускладаем. Чым небяспечны высокі ціск і чаму ён павышаецца, калі варта пачынаць яго кантраляваць і як з ім «ужыцца», расказала загадчык аддзялення Фрунзенскага раённага кардыялагічнага цэнтра (на базе 31-й гарадской паліклінікі Мінска) Арына БАСАВА.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Арына Аляксандраўна, з якога ўзросту варта пачынаць кантраляваць свой артэрыяльны ціск?

— Адзінкавыя вымярэнні павінны быць з дзяцінства. А вось ужо з 16 гадоў варта ўдзяліць гэтаму больш сур'ёзную ўвагу, бо лічыцца што сардэчна-сасудзістая сістэма ў гэтым узросце практычна не адрозніваецца па функцыянаванні ад дарослай. Калі лічбы артэрыяльнага ціску ў норме, то дастаткова раз на тры-пяць гадоў іх кантраляваць. Калі лічбы павышаныя, то згодна з апошнімі еўрапейскімі рэкамендацыямі, абавязкова варта сачыць за імі, у тым ліку ў хатніх умовах. Зразумела, пры штогадовым праходжанні дыспансерызацыі ў паліклініцы кожны доктар — і ўчастковы тэрапеўт, і доктар вузкай спецыялізацыі — павінен змерыць пацыенту ціск. І калі раней лічбы былі ў норме, а спецыяліст раптам выявіў іх павышэнне, такі пацыент адразу накіроўваецца на кансультацыю да ўчастковага тэрапеўта для верыфікацыі (пацвярджэння ці абвяржэння. — **Аўт.**) дыягназу і далейшай дыягностыкі.

— З 40 гадоў узровень ціску трэба вымяраць кожны дзень?

— Усё залежыць ад таго, якія лічбы мы маем, і тут не важна, 17 вам гадоў ці 60. Лічбы нормы артэрыяльнага ціску для ўсіх аднолькавыя. У канцы 2018 года былі распаўсюджаны новыя еўрапейскія рэкамендацыі, згодна з якімі сісталічны ціск павінен быць менш за 140, дыясталічны — менш за 90, і набліжацца да 120/80, калі пацыент гэта добра пераносіць.

Што датычыцца ўзросту, то не зусім правільна казаць, што пасля 40 гадоў варта кантраляваць ціск штодзень. Сёння артэрыяльная гіпертэнзія маладзее, таму насцярожанасць трэба праяўляць у любым узросце. Больш лаяльныя адносіны да лічбаў у сталых людзей, якім за 80 гадоў. Калі такія пацыенты здавальняюча адчуваюць сябе з ціскам 150—155/90, мы стараемся істотна яго не паніжаць. Бо карэкцыя ў такім узросце павышае рызыку захворванняў галаўнога мозга, да таго ж зніжаецца функцыя нырак. Пацыенты, як правіла, пачынаюць дрэнна сябе адчуваць, бо ў іх хутчэй за ўсё ўжо маецца атэрасклероз сасудаў галаўнога мозга, а гіпатэнзіўныя лекавыя прэпараты прывядуць да пагаршэння кровазабеспячэння галаўнога мозга і нырак. Але ціск не павінен зашкальваць — быць вышэй за 150—155/90.

— Чаму павышаецца артэрыяльны ціск?

— Прычын гэтаму шмат. Часцей за ўсё — спадчынны фактар. Ёсць і другасныя артэрыяльныя гіпертэнзіі, якія развіваюцца ў выніку захворванняў іншых органаў — эндакрыннай паталогіі, хвароб галаўнога мозга, нырак. Артэрыяльная гіпертэнзія можа развівацца на фоне прыёму гарманальных прэпаратаў, вялікіх доз нестэроідных супрацьзапаленчых сродкаў. Уплывае і наш лад жыцця. І тое, што мы ўпускаем момант пачатку лячэння. Даследаванне Steps выявіла, што лад жыцця ў вялікай частцы беларусаў далёкі ад ідэальнага. Шырока распаўсюджана курэнне, ужыванне алкаголю. Мы вельмі мала ядзім гародніны і фруктаў. Шмат людзей — каля 25 % — пакутуе на атлусценне, у 60 % нашага насельніцтва лішняя маса цела. Павышаны артэрыяльны ціск мае 44—45 % беларусаў. Людзі жывуць з гэтымі фактарамі рызыкі шмат гадоў. І прыходзяць да ўрача з багажом шкодных звычак і шматгадовым стажам павышанага артэрыяльнага ціску — нават 10-гадовым. У такім выпадку вярнуць ранейшы стан сардэчна-сасудзістай сістэмы ўжо немагчыма. І задача кардыёлага ці тэрапеўта — не даць прагрэсіраваць хваробе, замарудзіць развіццё ўскладненняў і дзесьці нават павярнуць час назад — правесці прафілактыку паражэнняў органаў-мішэняў. Задача няпростая, паколькі пацыент мае шматгадовы стаж павышанага ціску.

— У чым небяспека высокага ціску?

— Небяспека не ў самім высокім ціску, а ва ўскладненнях. Найперш гэта павелічэнне рызыкі вострых сардэчна-сасудзістых катастроф — інфарктаў, інсультаў. Як ні сумна, але захваральнасць і смяротнасць ад хвароб сардэчна-сасудзістай сістэмы ў нашай краіне знаходзіцца на першым месцы. Трэба апасацца і паражэння органаў-мішэняў. Гэта тыя органы і сістэмы, якія маюць шырокую капілярную сетку — галаўны мозг, сятчатка вока, сэрца, каранарныя сасуды, перыферычнае кровазабеспячэнне канечнасцяў і ныркі. Яны першымі трымаюць удар, што праяўляецца ў выглядзе інсультаў, інфарктаў, кровазліцця ў сятчатку вока, прагрэсіравання хранічнай ныркавай недастаткоўсасці, аблітэрыруючага атэрасклерозу сасудаў ніжніх канечнасцяў. Гэта самыя грозныя ўскладненні.

— Прэпараты ад артэрыяльнай гіпертэнзіі трэба прымаць усё жыццё?

— Існуе ўсяго пяць груп прэпаратаў ад артэрыяльнай гіпертэнзіі, іншая справа, што назваў, варыяцый у іх прыёме, схем лячэння вельмі шмат. Але ёсць адзін вельмі важны прынцып у тэрапіі артэрыяльнай гіпертэнзіі — пастаянны прыём. Канешне, пацыент, асабліва калі яму ўсяго 40 гадоў, гэта адразу ўспрымае з насцярожанасцю. Але па-іншаму ніяк — прэпарат, доза, калі трэба — камбінацыя заўсёды падбіраюцца індывідуальна, прымаюцца доўга, пад пастаянным кантролем урача.

— А калі ціск нармалізаваўся, можна перастаць піць лекі?

— Не. Мы ўсё роўна прымаем свой прэпарат у той жа дазіроўцы. Трэба разумець, што менавіта на фоне прыёму лекаў мы дасягнулі мэтавых лічбаў ціску. І толькі пры ўмове рэгулярнага прыёму мы замаруджваем рызыку ўскладненняў і паражэнне органаў-мішэняў. Няправільна прымаць гіпатэнзіўныя прэпараты сітуацыйна, ад выпадку да выпадку, часта мяняць іх без прызначэння па парадзе знаёмых. Кожны лекавы сродак мае свае супрацьпаказанні, лячэбныя дазіроўкі і падбіраецца індывідуальна. Калі пацыент прымае прэпарат сітуацыйна, у яго нестабільныя лічбы артэрыяльнага ціску на працягу дня, могуць здарацца эпізоды гіпертанічных крызаў. У такіх хворых пачашчаецца колькасць шпіталізацый, выклікаў хуткай дапамогі. І зразумела, мэта, да якой мы ідзём, не будзе дасягнута: не адбываецца лячэння тых органаў, на якія ўплывае артэрыяльная гіпертэнзія. Сітуацыйны прыём не падыходзіць ні ў якім разе.

— Часта даводзіцца чуць, што прэпарат перастаў дзейнічаць. Такое сапраўды бывае?

— Так званае «выслізгванне доз» бывае не часта. У такога пацыента варта сабраць падрабязны анамнез: як ён прымае прэпарат, наколькі рэгулярна, ці ў той дозе, якой прызначана. Калі прэпарат сапраўды не дае патрэбнага эфекту, спрабуем павялічыць дозу да максімальна дазволенай, калі і гэта не дапамагае, тады замяняем на іншы. Зараз часта прызначаюцца камбінаваныя лекі — 2-3 прэпараты ў адной таблетцы. Гэта павялічвае эфектыўнасць лячэння, пацыенту больш зручна замест 2-3 таблетак прымаць адну адзін раз на дзень.

— Як хутка пасля пачатку лячэння ціск павінен нармалізавацца?

— Не трэба імкнуцца дасягнуць мэтавых лічбаў з першай таблеткі. Ціск зніжаецца паступова — на працягу дзесьці трох месяцаў. Некаторым патрабуецца крыху менш часу, некаторым — крыху больш, у цэлым за гэты перыяд звычайна ўдаецца падабраць эфектыўную індывідуальную тэрапію. Варта памятаць, што пры лячэнні артэрыяльнай гіпертэнзіі першыя сустрэчы з доктарам будуць частымі, сам урач вызначае, калі пацыент наступны раз павінен прыйсці для кантролю.

— Анамальная спякота для людзей з гіпертаніяй небяспечная ці, наадварот, гэта для іх спрыяльнае надвор'е?

— Спякоту гіпертонікі пераносяць цяжка. У часткі пацыентаў на фоне такога надвор'я паніжаецца ціск. Ім нават даводзіцца памяншаць дозу гіпатэнзіўных прэпаратаў, бо яны дрэнна сябе адчуваюць з паніжанымі лічбамі. У спякоту гіпертонікам абавязкова трэба насіць галаўны ўбор, заўсёды мець з сабой бутэлечку вады, бо ўзмацняецца потааддзяленне, а таксама прэпараты для купіравання гіпертанічных крызаў. І старацца не выходзіць на вуліцу ў самую спёку.

Асцярожна, лета!

Як абараніць дзяцей ад траўмаў пры катанні на веласіпедах і самакатах

Летам вывіхі, расцяжэнні і пераломы здараюцца ў дзяцей ледзь не часцей, чым у зімовы галалёд. Адбываецца гэта таму, што летам дзеці больш актыўныя і свабодныя. А яшчэ таму, што цёплая пара — час роваравў, электрасамакатаў, гіраскутараў і іншых сродкаў перамяшчэння.

— У час летніх канікул практычна штодзень у нашу паліклініку звяртаюцца з траўмамі, атрыманымі падчас катання на такіх сродках, — кажа **загадчык хірургічнага аддзялення дзіцячай паліклінікі № 2 Гродна Валерый ПЫЖ**. — Тым больш што цяпер гэта ўсё можна ўзяць напракат. Дзеці не выконваюць тэхніку бяспекі, катаюцца без адпаведнай экіпіроўкі: шлемаў, накаленнікаў і налакотнікаў.

Паводле слоў спецыяліста, у выніку падзенняў дзеці часцей за ўсё атрымліваюць закрытыя чэрапна-мазгавыя траўмы (страсенні мазгоў), удараныя раны, ранкі твару. Нярэдкія і траўмы канечнасцяў — пераломы рук, вялікія скальпаваныя раны каленных і локцевых суставаў, якія дрэнна загойваюцца і могуць прыводзіць да ўтварэння рубцоў.

— Першая дапамога бацькоў ці дарослых у такіх выпадках — вызваліць рану ад пабочных прадметаў, прамыць праточнай вадой, можна з мылам, накласці чыстую павязку і звярнуцца да доктара, — нагадвае Валерый Пыж.

Ёсць і спецыфічныя траўмы, якія дзеці атрымліваюць з-за бесклапотнасці саміх дарослых. Нярэдка 3—6-гадовых малых садзяць на багажнік веласіпеда. Падчас руху нага трапляе ў кола — і дзіця атрымлівае пералом шчыкалаткі, глыбокія скальпаваныя раны, якія марудна паддаюцца лячэнню і пакідаюць рубцы.

— Дарослым трэба памятаць аб мерах бяспекі: маленькіх дзяцей лепш не перавозіць на багажніку. У адваротным выпадку ровар павінен быць абсталяваны ахоўным кажухом, павінна быць велакрэсла для перавозкі дзяцей, — папярэджвае спецыяліст.

Дарэчы, на базе дзіцячай паліклінікі № 2 Гродна працуе падрыхтоўчы цэнтр для бацькоў па навучанні правілам бяспекі. На лекцыях, якія суправаджаюцца відэаматэрыяламі, спецыялісты расказваюць і паказваюць, як арганізаваць прастору ў кватэры, каб яна была цалкам бяспечнай для самых маленькіх, як зберагчы ад траўмаў больш дарослых дзяцей і інш. Трапіць на заняткі можна, папярэдне запісаўшыся па гарадскім тэлефоне 52-14-10.

Спытайце пра радзіннае

Чаму нельга раскідаць валасы?

«Нядаўна прыехалі да бабулі ў вёску, дачка стала расчэсвацца, а валасы з расчоскі выкінула ў смецца. Бабуля, бачачы гэта, пачала на яе сварыцца: нельга так рабіць, а то галава балець будзе. Мы толькі пасмяяліся: маўляў, прымхі ўсё гэта. А потым я падумала: але ж аднекуль гэта забарона ўзялася. Можа, вы падкажаце, з чым яна звязана?» — піша Тамара Пятроўна П. з Мінска.

Валасы сталі аб'ектам пільнай увагі ў абрадавай практыцы беларусаў і іншых славянскіх народаў, а таксама апынуліся тым рытуальным атрыбутам, вакол якога сфарміравалася мноства разнастайных забаронаў і прадпісанняў. Відавочна, што нават у сітуацыях, далёкіх ад абрадава акцэнтаваных, у стаўленні да валасоў захоўвалася пэўная сакральнасць. Напрыклад, традыцыя забараняла расчэсваць валасы на Дабравешчанне (прыгадайце: «На Дабравешчанне птушка гнязда не ўе, дзеўка касы не пляце»), але поле яе ўздзеяння распасціраецца і на штодзённасць: калі ў расчосцы засталіся валасы, выкідваць іх куды папала строга забаранялася. Яны маглі патрапіць у рукі нядобрасумленных людзей, і тыя маглі лёгка аказаць уздзеянне на іх гаспадара. Каб пасварыць маладых, досыць узяць некалькі валасінак і выканаць з імі некаторыя магічныя дзеянні. Таму неабходна сачыць за тым, каб валасы не трапілі ў чужыя рукі.

Да таго ж, дрэнную службу маглі саслужыць былому гаспадару валасоў птушкі. Увесну яны збіраюць прыродны матэрыял для ўмацавання гнёздаў. Адным з найлепшых канструкцыйных матэрыялаў маглі быць доўгія валасы. Уся бяда ў тым, што птушкі ўюць свае гнёзды, як правіла, на дрэвах, якія размешчаны ў геапатагенных зонах са знакам мінус. Праз уздзеянне сіл прыроды на асобны волас здзяйсняецца адпаведны ўплыў і на яго гаспадара. Таму ў асяроддзі беларусаў асабліва асцерагаліся раскідаць валасы дзе папала, каб не справакаваць з'яўленне каўтуна — даволі цяжкага захворвання, якое характарызуецца скручваннем і збіваннем валасоў «на валёнак» (вельмі падобны на лямец), расчасаць якія немагчыма, акрамя таго змена структуры валасоў суправаджаецца галаўнымі болямі. У ранейшыя часы, калі ў кожнай хаце былі печкі, валасы спальвалі, а там, дзе былі рэкі, пускалі на ваду, «каб валасы раслі хутка і густа». Калісьці сярод беларусаў існавала традыцыя састрыжаныя валасы збіраць і захоўваць на працягу жыцця, каб «узяць» іх на «той» свет і «адчытацца за кожную валасінку»: пасля смерці іх укладвалі ў падушку і клалі пад галаву нябожчыка.

У традыцыйнай культуры ўсходніх славян валасы заўсёды сімвалізавалі мноства, а таму багацце і шчасце. Так, на Каляды гаспадару жадалі гэтулькі цялят, авечак у статку, вазоў жыта і да т. п. колькі валасоў на галаве. У славянскіх народаў у адносінах да валасоў сфарміраваўся шэраг іншых рэгламентацый, напрыклад, каб валасы хутка адрасталі, раілі стрыгчыся, калі Месяц прыбывае, так і валасы будуць «расці-прыбываць». Калі валасы пастаянна стрыгчы на ўбываючым Месяцы або калі яго няма ўвогуле (Межы), яны перастануць расці зусім.

Дзіцяці да года забаранялася стрыгчы валасы (каб не «адрэзаць мову», г. зн. не спыніць яго разумовае развіццё і здольнасць размаўляць). Першае рытуальнае астрыганне — застрыжкі — выконвалі роўна ў год. Гэтым абрадавым дзеяннем імкнуліся падкрэсліць завяршэнне першага пераходнага перыяду ў жыцці чалавека.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Каб помнілі

«ІВАНУ ТАДЫ ШОЎ ДВАЦЦАТЫ...»

У нашай сям'і заўжды любілі слухаць успаміны: прабабкі Вольгі — пра жыццё ў пана Вайніловіча, бабулі Таццяны — пра вайну з немцамі...
Нешта з пачутага мая мама запісвала, так што мне засталося толькі надрукаваць і даслаць у «Звязду», якую ў нас чытаюць многія.

...Першыя дні вайны жыхарам вёскі Браткава запомніліся паветраным боем: фашысцкія сцярвятнікі з чорнымі крыжамі на крылах дагналі тады невялікі савецкі самалёт з эмблемай чырвонага крыжа і збілі. Палаючы, ён «увайшоў» у зямлю на ўскрайку вёскі. Людзі кінуліся туды, але зрабіць нічога не маглі... Хіба потым — сабраць астанкі тых, хто загінуў, і пахаваць. Каго — так і невядома.

Фронт між тым адыходзіў на ўсход, і ледзь не кожны дзень прыносіў кепскія навіны. Калгасных жывёл разабралі жыхары, а 28 чэрвеня ў вёсцы ўжо былі немцы. Яны сагналі людзей на сярэдзіну вуліцы і аб'явілі, што сяляне вызвалены ад улады камуністаў і цяпер павінны дапамагаць вялікай Германіі, што ў вёсцы назначаецца староста, што ягонае слова — закон, за невыкананне якога — расстрэл і не іначай.

Але ж браткаўцы не скарыліся немцам — у службу да іх ніхто не пайшоў. У лесе за вёскай Заракаўцы сталі збірацца камуністы, кіраўнікі мясцовых арганізацый, якія хаваліся ад фашысцкай расправы, тыя, хто не хацеў мірыцца з «новым парадкам». Там жа апынуўся Іван — старэйшы сын майго прадзеда Івана Мікітавіча Місевіча, які ў сваёй хаце стаў пячы партызанам хлеб.

...Жнівень 41-га. У вёску на падводах прыехалі паліцаі. Людзі, пазамыкаўшы хаты, кінуліся хавацца. У сваю хованку — лаз у зямлі, зверху закрыты дошкамі і дзёрнам, з якога нават рос куст — кінулася і сям'я прадзеда.

Немцы з паліцаямі пайшлі па хатах. Яны збівалі замкі, усё, што хацелі, складвалі ў мяхі, грузілі на падводы, і ўрэшце з'ехалі. Вяскоўцы, вярнуўшыся дамоў, гаравалі аб стратах. Не было іх хіба ў сям'і Місевічаў (нават хлеб партызанскі ў печы застаўся). А ўсё таму, што ўцякаючы, дамачадцы не паспелі зачыніць вокны. «А калі расчыненыя, то ў хаце браць нама чаго», — падумалі, відаць, паліцаі і, на шчасце, туды не зайшлі.

А вось нямецкая мотапяхотная часць у канцы верасня ў вёсцы спынялася. Афіцэры размеркавалі салдат на начлег, выставілі ахову. Пры гэтым мясцовыя падлеткі зглядзелі, што зброю ваякі злажылі ў адной з камор. Там было невялічкае акенца. Праз яго самы шчуплы з кампаніі хлапчукоў залез у памяшканне і стаў выкідваць аўтаматы.

Узялі іх столькі, колькі маглі панесці, схавалі ў былым калгасным гумне, каб пазней перадаць партызанам.

Раніцай афіцэры пастроілі салдат, каб рухацца далей, у бок фронту і, вядома ж, заўважылі, што адно з падраздзяленняў... абязброена. Шукаць вінаватых, на шчасце, не было калі: немцы вельмі спяшаліся. А малодшы сын прадзеда — Сеня Місевіч у той вечар прыйшоў дадому цішком і позна. На ўсе папрокі маці адказваў, што брату ды іншым партызанам не хапае зброі.

І гэта была не адна яго вылазка.

Жыхары вёсак збіралі для партызан хто што мог. Прыпасы хавалі ў лясным тайніку. А вось хлеб...

Каб мець муку, Іван Місевіч зрабіў жорны (з пачаткам вайны калгасны млын не працаваў). Яго жонка са старэйшай дачкой мясілі цеста. Гэта можна было рабіць цішком, неўпрыкмет для вёскі, а вось пячы...

Пах хлеба, які ішоў праз комін і вокны, утаіць было немагчыма. Суседзі ўсё чулі, усё разумелі, але, дзякуй богу, маўчалі.

...Яшчэ адзін дзень. Раніцай другога кастрычніка па полі, дзе вяскоўцы дакопвалі бульбу, пранёсся коннік — папярэдзіў, што ідуць карнікі. Місевічы пабеглі ў сваю схованку. Туды ж забралі суседскую дзяўчынку Маню, якая на падворку гуляла з іх малодшай Таняй. Усе разам нейкі час прасядзелі, потым Іван Мікітавіч адсунуў накрыўку, каб паглядзець, што дзе робіцца. Ён толькі падняў галаву і ўбачыў, што на іх падворку стаіць немец і... махае яму рукой: маўляў, ідзі сюды.

Дзядуля асеў у яму і дрыжачым голасам паведаміў сваім, што фашыст яго заўважыў і што яму трэба ісці здавацца... Аднаму. Ён стаў з усімі адвітацца, бо разумеў, што яго, як бацьку партызана, ніхто не пашкадуе.

Дзеці, вядома ж, пачалі плакаць. Бабуля казала, што лепей пойдзе яна, бо мужчына цяпер патрэбен болей... Дзядуля яе не пусціў. Напружанне было невыноснае, бо абое думалі, як ратаваць дзяцей...

Яны ўжо развіталіся і з жыццём, і адно з адным, калі гаспадар зноў выглянуў на вуліцу, дзе... немцаў ужо не было: не знайшоўшы нікога і нічога, яны пакінулі вёску. А перад гэтым проста махалі адзін аднаму, клічучы на збор...

У тую ж ноч дамоў прабраўся Іван. Ён нічога не расказваў аб жыцці ў партызанах, але ўсе і так усё разумелі: хлопец быў худы, нямыты-нястрыжаны, у папрэлым, вышывым адзенні...

Праз два дні ён вярнуўся ў атрад разам з меншым братам Сямёнам, які ў свае 16 быў вельмі дужы і смелы.

Аднойчы, расказвалі, ён даведаўся, што немцы ў Дзягцяняя павязуць пошту, што будуць праязджаць па дарозе паміж вёскамі Савічы і Заракаўцы, месцамі — цераз лес ды кусты, дзе ён і затаіўся. А потым пачуў, што заляскалі колы падводы, убачыў, што на вазку — два немцы. Адзін з іх кіраваў канём (аўтамат ляжаў на каленях), другі — драмаў ззаду. Сеня выскачыў з кустоў, схапіў аўтамат і кінуўся ў лес. Другі немец пачаў страляць, але ніводная куля хлопца не дагнала, бо ён... не ўцякаў: крыху адбегся і сеў на зямлю за тоўстае дрэва.

Немцы следам за ім ісці пабаяліся — паехалі далей. А Сямёна з радасцю сустрэлі ў атрадзе: два браты Місевічы сталі ваяваць поплеч.

...Пазней іх маці, а мая прабабка Вольга Пятроўна, успамінала, што старэйшы з сыноў часам з недаверам казаў: «Няўжо вы, мама, будзеце такая шчаслівая, што ў гэткай страшнай вайне нікога з сям'і не страціце? Калі што — будзьце мужнай... Усялякае можа стацца...»

Ён, на жаль, не памыліўся. У адной з сутычак з немцамі паблізу ад Сямёна ўзарвалася асколачная граната. Ён упаў, асколкі трапілі ў спіну, трохі ніжэй лапаткі. Хірурга ў атрадзе не было, раны на маладым целе хутка зацягнуліся... А вось у сталым узросце Сямёну Іванавічу яны шмат крыві папсавалі.

...Зіма 1943-га была суровая, у вёсцы заставаліся лічаныя каровы і коні.

З надыходам вясны тыя, у каго былі хоць нейкія сілы і магчымасці, садзілі бульбу.

Партызаны летам 1944-га ліквідавалі некалькі гарнізонаў (у Цімкавічах быў адноўлены), групы амаль штодзённа выходзілі на заданні, працавала разведка...

Не дажылі да вызвалення камісар атрада І. К. Жыжык (загінуў у няроўным баі) і Іван Місевіч. Перад выхадам на чарговае заданне ён узяў са скрынкі гранату, у якой, за нешта зачапіўшыся, саскочыла кальцо.

Кінуць яе не было куды — навокал людзі... Тады ён прытуліў гранату да сябе і пабег за бліжэйшыя дрэвы.

Прагучаў выбух, сябры кінуліся да Івана. Ён яшчэ паспеў папрасіць, каб яго перавязалі...

Пахавалі хлопца (Івану тады ішоў 20-ы) там жа, на базе ў Вялешынскім лесе, 2 мая 1944 года. Да вызвалення Беларусі не заставалася, можна сказаць, нічога.

Праз тры месяцы бацька зрабіў дамавіну і перавёз астанкі сына на брацкія могілкі ў вёску Савічы — пахаваў як належыць, па хрысціянскіх законах. Таму прозвішча Івана Місевіча на чорным абеліску зусім не выпадковае. Сямён жа працягваў змагацца ў атрадзе імя Шчорса.

...Прыйшло вызваленне, адбылася Перамога, адрадзілася і жыве знявечаная немцамі Капыльшчына! Вось толькі страты вярнуць немагчыма.

Вольга РАДКЕВІЧ, загадчыца філіяла Цімкавіцкай сельскай бібліятэкі.

З нізкім паклонам

Ён не памёр! Ён недзе тут...

Вялікі Беларус, Грамадзянін, Васіль Вялікі...

Гэтыя словы ў адносінах да Васіля Быкава нават пры жыцці яго не здаваліся гучнымі, а смерць толькі падкрэсліла маштаб асобы. 22 чэрвеня 2003 года пісьменніка не стала, і гэта было расстанне з цэлай эпохай, бо яго творы вучылі нас праўдзівасці і спагадзе, бо яго досвед — жыццёвы і творчы — быў духоўным арыенцірам.

Варта адзначыць, што шлях у зорную вечнасць пачаўся для Быкава ў нашым найпрыгажэйшым, найбеларускім Гродне. Прыехаў ён сюды ў 1947-м пасля дэмабілізацыі, працаваў у рэдакцыі «Гродзенскай праўды». Менавіта тут адбыўся яго літаратурны дэбют: выйшлі першыя апавяданні «У той дзень» і «У першым баі». Тут ён ажаніўся, стаў бацькам. Мала хто, мусіць, ведае, што ў Гродне сям'я пісьменніка змяніла тры кватэры, мела тры адрасы: вуліца Вялікая Траецкая, вуліца Свярдлова і вуліца Парыжскай Камуны, дзе ствараліся вядомыя на ўвесь свет аповесці «Жураўліны крык», «Альпійская балада», «Трэцяя ракета», «Мёртвым не баліць»... А таму ўсе гродзенцы лічаць Васіля Быкава сваім, кажуць, што гэта наш горад з яго ўнікальнай гісторыяй, архітэктурай, культурай і непаўторным шармам стварыў Майстра такога маштабу.

Я лічу, самая істотная заслуга Быкава ў тым, што ў сваіх творах ён здолеў праўдзіва напісаць пра асобна ўзятага чалавека, пра ягоны боль, сумненні і перажыванні, пра вострую неабходнасць выбару, які гэтаму чалавеку трэба зрабіць — самому. А таму ўздзеянне яго твораў на свядомасць чытача можна параўнаць з электрашокавай тэрапіяй — чымсьці вельмі балючым, але карысным і патрэбным.

...Вельмі прыемна, што ў нашым горадзе і сёння жывуць тыя, хто блізка ведаў вялікага пісьменніка, хто сябраваў з ім, тыя, хто дыхаў з ім адным паветрам, еў адзін хлеб, чытаў, чытае і будзе чытаць «нашага Васіля». І таму ён не памёр! Ён недзе тут — у паветры, у душах.

Валянціна ЯТКОЎСКАЯ, *настаўніца СШ № 22, г. Гродна.*

След на зямлі

СПЫНІЦЦА, КАБ АЗІРНУЦЦА...

Надзеі Піліпаўне Шабацьцы з вёскі Выганашчы 95!
Баявая ды працавітая ў маладосці, да падарункаў і кветак жанчына так і не прывыкла. Але ж відаць было — рада, што не забыліся пра яе свята ні родныя, ні ўлада, ні працоўны калектыў, адкуль пайшла на пенсію. А тут яшчэ і госці з гарманістам прыехалі, заспявалі «Як была я маладой» — і на вуліцу павысыпалі ўсе.

Віншавалі юбілярку яе родныя: сын Мікалай і дачка Валянціна, ад якіх сям'я прырасла сямю ўнукамі і шаснаццаццю праўнукамі, старшыня і кіраўнік справ Целяханскага сельвыканкама Трафім Дзямянчык і Алена Кайль, намеснік старшыні па ідэалагічнай рабоце ААТ «Целяханы-агра» Таццяна Іванова, старшыня Савета ветэранаў сельвыканкама Святлана Крэк.

Фота Алены КАЙЛЬ.

Юбілярка з гарманістам Паўлам МЯЛІКАМ.

Працоўная дзейнасць юбіляркі звязана з калгасам «Радзіма», які быў далучаны да «Расіі» (цяпер ААТ «Целяханы-агра»). Працавала Надзея Піліпаўна кладаўшчыцай, для дзяцей была і татам, і мамай: сама гадавала, сама будавала дом, які і сёння выглядае досыць дыхтоўна.

Жыве юбілярка разам з сям'ёй сына. І ён, Мікалай, і нявестка Наталля, іх дзеці-ўнукі ставяцца да матулі-бабулі з любоўю і клопатам, што, відаць, і стала падмуркам даўгалецця... Як і аптымізм, як прага да жыцця.

Валянціна БОБРЫК.